

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

# Газета Слонімская

№47 (285) 21 — 27 лістапада 2002г. Наклад 11.800 экз. Кошт 320 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ

Слонім,
Зэльва,
Дзятлава,
Масты,
Ваўкавыск,
Шчучын,
Ліда,
Гродна,
Баранавічы,
іншыя гарады Беларусі,
а таксама на HTTP://gs.promedia.by

АБАГРАВАЛЬНЫ СЕЗОН

## Без дзяржаўнай датацыі кошт цвёрдага паліва
# ЛЮДЗЯМ БУДЗЕ НЕ ПА КІШЭНІ

Фота Віталя ГІЛЯ

Хутка зіма. Людзі стараюцца своечасова падрыхтаваць паліва да першых снежаньскіх маразоў. Галоўным палівам для сельскіх жыхароў з'яўляюцца дровы. На сённяшні дзень кошт на іх самы танны ў параўнанні з вугалем і брыкетам.

(Працяг тэмы на 3 стар.)

ПОДПИСКА-2003

## СТОИМОСТЬ ПОДПИСКИ НА ИЗДАНИЯ ВОЗРОСЛА

**В Беларуси идет подписка на газеты и журналы на первое полугодие 2003 года. По сравнению с первым полугодием нынешнего года стоимость белорусских и особенно иностранных печатных СМИ существенно возросла.**

В частности, полугодовые комплекты газет "Советская Белоруссия", "Рэспубліка" и "Народная газета" (для индивидуальных подписчиков, без учета льгот и скидок) подорожали на 59,1 процента (каждый – с 13 200 рублей на первое полугодие 2002 года до 21 000 рублей на первое полугодие 2003 года).

Стоимость подписки на газету "Народная воля" (для индивидуальных подписчиков, без учета льгот и скидок) увеличилась на 66,7 процента (с 18 000 до 30 000 рублей).

Самыми дорогими белорусскими изданиями являются "Спорт-экспресс" в Белоруссии" – 101 100 рублей за полугодовой комплект, "Белорусская торговая газета" – 88 092.

По сравнению, цена подписки на полугодие на «Газету Слонімскую» совсем низкая. Например, для индивидуального подписчика она составляет всего 12 942 рубля. А если житель Слонима подписался в редакции газеты или в местном отделении «Беларусбанка», итого меньше – 11 160 рублей. Отметим, что читатель «Газеты Слонімскай» будет постоянно находиться в центре событий, которые происходят в нашем и соседних районах, в стране и за рубежом. Вместе с газетой вы будете дополнительно получать цветное телевизионное приложение «Плюс TV». Более того, подписчик «ГС» на 1-ое полугодие 2003 года автоматически становится участником розыгрыша ценных призов, среди которых главный приз – холодильник.

Помимо местных в каталоги включены издания 16 стран ближнего и дальнего зарубежья (России, США, Великобритании, Литвы, Франции и других). Среди газет дальнего зарубежья (подписка на них проводится на период с 1 февраля 2003 года по 31 января 2004 года) самыми дорогими являются британские "The Times" – 6 227 050 рублей (3 291 доллар США).

**Редакция**

## КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

в г. Слониме по состоянию на 10[00] 19.11.2002г.

| "Беларусбанк" | | |
|---|---|---|
| | Покупка | Продажа |
| 1 USD | 1900 | 1925 |
| 1 EURO | 1885 | 1935 |
| 1 ZL | 455 | 490 |
| 1 RUR | 58 | 60 |
| **оао "Белпромстройбанк"** | | |
| | Покупка | Продажа |
| 1 USD | 1910 | 1930 |
| 1 EURO | 1885 | 1930 |
| 1 ZL | 465 | 495 |
| 1 RUR | 58.5 | 60 |
| **"Белагропромбанк"** | | |
| | Покупка | Продажа |
| 1 USD | 1910 | 1925 |
| 1 EURO | 1870 | 1910 |
| 1 RUR | 57 | 60 |
| **Нацбанк РБ** | | |
| 1 USD | 1893 | |
| 1 EURO | 1908.62 | |
| 1 RUR | 59.48 | |

НАША ЭКАНОМІКА

# БОЛЬШ НЯМА СІЛ ЦЯРПЕЦЬ

**Днямі на імя прэм'ер-міністра Генадзя Навіцкага быў накіраваны ліст-зварот ад работнікаў Слонімскай камвольна-прадзільнай фабрыкі, які падпісалі 477 чалавек.**

Нагадаем, што ў апошні час гэта прадпрыемства ў большасці прастойвае, чым працуе. Людзі, даведзеныя да адчаю з-за адсутнасцю сродкаў для існавання, пішуць пісьмо ў Мінск з надзеяй, што ім дапаможа кіраўніцтва рэспублікі. Бо звароты да мясцовага раённага начальства не прынеслі пэўных вынікаў.

*"Мы працуем па 3-8 дзён у месяц. Заробак пастаянна затрымліваюць на месяц, а то і на два. У многіх з нас на прадпрыемстве працуюць муж і жонка, таму ў такіх сем'ях грошай няма нават на хлеб, не кажучы ўжо пра аплату за камунальныя паслугі. З верасня пачалося скарачэнне работнікаў. Людзі са стажам працы на фабрыцы па 20 і болей гадоў становяцца беспрацоўнымі. Мы разумеем, што гэта вымушаная мера, але ад гэтага нам не становіцца лягчэй. Слонім наш невялікі, і знайсці працу немагчыма, бо новых працоўных месцаў у горадзе не ствараецца. На іншых мясцовых прадпрыемствах эканамічная сітуацыя не лепшая...*

*Мы хочам працаваць, як прынята заканадаўствам, 40 гадзін у тыдзень, а не тры дні ў месяц...*

*Вельмі спадзяемся, што Вы ў кароткі тэрмін прымеце неабходныя рашэнні для выхаду фабрыкі з крызісу, і мы зможам спакойна жыць і працаваць, бо абяднелі да такой ступені, што больш няма сіл цярпець".*

Гэта невялікая вытрымка з пісьма камвольшчыкаў да прэм'ер-міністра краіны. Людзі яшчэ жывуць надзеяй, што ўсё ж сітуацыя на прадпрыемстве выправіцца, і спадзяюцца на дапамогу апошняй сталічнай інстанцыі.

У сваю чаргу Слонімскі выканкам у сваім лісце на запыт рабочых патлумачыў, што цяпер фабрыка сапраўды знаходзіцца ў цяжкім фінансавым становішчы. Толькі за 9 месяцаў гэтага года страты прадпрыемства склалі 1,5 мільярда рублёў, а запазычанасць за энергарэсурсы, сыравіну, банкаўскія пазыкі і іншае дасягнула 8,8 мільярда рублёў. Далей паведамляецца, што аблвыканкам хадатайнічае перад урадам рэспублікі аб прадастаўленні прадпрыемству падаткавага крэдыту для закупкі сыравіны, а таксама просіць адтэрміноўку па выплаце запазычанасці за спажыванне газу і электраэнергіі да 31 снежня 2006 года і адтэрміноўку запазычанасці па выплатах у фонд сацыяльнай абароны да 31 снежня 2003 года. У выніку такой дапамогі, улады спадзяюцца, што ў прадпрыемства з'явяцца сродкі, каб набыць сыравіну і своечасова выплочваць людзям заробак.

Пытанне толькі ў тым: ці дасць урад згоду на падобныя льготныя ўмовы дзейнасці для КПФ, якая яшчэ некалькі гадоў таму з'ўялялася ў Слоніме адной з галоўных крыніц па адлічэнню грошай у бюджэт. А як вядома, сёння многія фабрыкі і заводы краіны маюць патрэбу ў падобнай дапамозе. Тады хто будзе плаціць падаткі, своечасова аплочваць вытворчых і іншыя выдаткі?

Больш таго, і абвясціць КПФ банкрутам для ўрадавых чыноўнікаў таксама будзе праблематычна, бо гэта прадпрыемства знаходзіцца ў спісе іншых рэспубліканскіх суб'ектаў гаспадарання, якія ні ў якім разе не павінны пайсці на продаж з малатка. А спіс той зацвярджаў асабіста сам прэзідэнт. Аднак Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка – не такое ўжо непатрэбнае прадпрыемства. Як стала вядома рэдакцыі "ГС", пэўныя асобы знарок мэтанакіравана даводзяць КПФ да стану, каб яе ўсё ж афіцыйна прызналі банкрутам, каб потым з нуля распачаць дзейнасць, а ў будучым цалкам выкупіць. І калі гэта сапраўды так, то камвольшчыкам прыйдзецца яшчэ мацней падцягнуць паясы і невядома колькі цярпець.

**Віктар ВАЛАДАШЧУК**

**P.S.** Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, стала вядома, што 18,6 % акцый на суму 3 640 903 340 рублёў, якія належаць КПФ, выстаўлены на продаж. Па ўмовах конкурсу пакупнік павінен інвеставаць у фабрыку 232 тысячы даляраў ЗША на працягу года з захаваннем працоўных месц на працягу трох гадоў. Конкурс павінен адбыцца ў Мінску 19 снежня 2002 года.

НОВОСТЬ

# БУДЕТ НОВАЯ ЗАПРАВОЧНАЯ СТАНЦИЯ

**В Слониме, недалеко от Лобазовского озера, что на улице Багратиона, через 8 месяцев появится новая заправочная станция.**

Об этом корреспонденту "ГС" сообщил прораб Волковысского строительно-монтажного треста №3 Иосиф Войтевщик. Новая заправка будет принадлежать Слонимскому предприятию по обеспечению нефтепродуктами, которым руководит Петр Турок.

По словам Иосифа Войтевщика, возле заправки планируется построить две стоянки для автомобилей, мойку. В связи со стройкой, в ближайшее время будет проведена реконструкция автобусной остановки.

Однако местные жители обеспокоены тем, что заправка строится рядом с водоёмом. А по действующему положению о водоохранных полосах водоемов Республики Беларусь минимальная ширина водоохранной зоны– не менее 500 метров, чтобы предотвратить загрязнение водоёма.

В частности, запрещается оборудование площадок для заправки аппаратуры ядохимикатами, размещение и строительство складов с нефтепродуктами, пунктов технического обслуживания и мойки техники и автотранспорта.

Как заявил Петр Турок, строительство идет согласно всем необходимым требованиям, в том числе экологическим. "Наша теперешняя заправка находится в 50 м от озера, и ничего страшного в этом нет, – отмечает Петр Иванович. – Однако, она требует модернизации, нужно новое техническое оборудование, поэтому мы и решились на строительство новой АЗС".

Фота Віталя ГІЛЯ

*К лету 2003 года обещают построить новую заправку*

По его словам, сначала была построена слонимская нефтебаза, а уже потом появилось озеро.

Исполняющая обязанности директора Слонимской инспекции охраны окружающей среды Вера Гордиенко в беседе с корреспондентом "ГС" отметила, что строительство новой заправки не отразится пагубно на качестве воды в озере.

"Накануне строительства АЗС, Гродненским областным комитетом природных ресурсов и охраны окружающей среды была проведена экологическая экспертиза. Комиссия отметила, что все строительные нормы выдержаны, поэтому на законных основаниях возле озера строится новая АЗС", – сказала Вера Гордиенко.

По её словам, при новой АЗС будет налажена очистка сточных вод и хозяйственно-бытовых стоков. "Поэтому нет необходимости волноваться, что озеро будет загрязняться", – заверила Гордиенская. В свою очередь, прораб Иосиф Войтевщик сказал, что их организация уже имеет опыт строительства современных АЗС.

«Мы построили пять заправок в Волковыске, одну в Минске, Мостах. Вскоре и у слонимчан появится совершенно новая, современная заправочная станция», – сказал Иосиф Иосифович.

**Ольга ШИНКЕВИЧ**

АКТУАЛЬНО

## ЭНЕРГОРЕСУРСЫ БЬЮТ ПО КАРМАНУ

**В начале ноября Министерство экономики Беларуси представило в правительство информацию о состоянии расчетов за потребленные энергоресурсы.**

Согласно информации, в сентябре 2002 года текущее потребление газа по республике оплачено в объеме 130,4 процента, электрической и тепловой энергии – 111,6 процента. Несмотря на это, в целом за январь-сентябрь уровень оплаты потребленного газа составил 95,1 процента, электроэнергии – 96,8.

В региональном разрезе, например, за январь-сентябрь Гродненская область оплатила за природный газ в размере 96,8 %, что несколько больше общереспубликанской цифры.

По данным же Слонимского районного отдела статистики, только по нашему, Слонимскому району, по состоянию на 1 октября 2002 года задолженность предприятий и организаций за энергоносители составила 11 миллиардов 84 миллиона 500 тысяч рублей. Из них, за электроэнергию задолженность перевалила за 6 миллиардов рублей, а за природный газ задолжали 5 миллиардов 35 миллионов 700 тысяч рублей.

Государственная поддержка, оказанная сельскохозяйственным организациям, позволила последним несколько улучшить расчеты за потребленную электрическую и тепловую энергию. За январь-сентябрь уровень оплаты в сельском хозяйстве составил 53,5 процента.

Тем не менее, долги сельскохозяйственных предприятий за энергоносители превышают задолженность промышленных предприятий. Так, к примеру, по Слонимскому району сельскохозяйственные предприятия за электроэнергию задолжали 4 миллиарда 414 миллионов 700 тысяч рублей, а промышленные предприятия – только один миллиард 568 миллионов 200 тысяч рублей.

В расчетах за природный газ ситуация несколько иная. Здесь промышленность района должна почти в два раза больше, нежели сельское хозяйство – 2 836,8 миллиона против 1 485,1 миллиона.

Не удивительно, что российские нефтегазовые концерны резко снизили поставки нефти и газа в Беларусь. Терпеть убытки и оплачивать из своего кармана белорусское "благополучие" вряд ли кто захочет. Даже если Беларусь и союзное государство с Россией.

Одиозная фигура белорусского президента, совершенно непредсказуемо мечущегося с Востока на Запад и в обратном направлении (это на языке белорусского лидера называется "многовекторная политика"), не вызывает особого доверия ни в России, ни в Западной Европе. Лукашенко исчерпал кредит доверия у своих восточных союзников, но признаваться в своих ошибках не собирается, а переходит в наступление и ставит жесткие ультиматумы российскому руководству.

Платить же за все придется белорусскому народу. Что он, в принципе, уже давно и делает. А экономика Беларуси постепенно разваливается, трещит по всем швам под чутким руководством президента.

**Ирина САЗАНОВИЧ, Валерий КОВАЛЕНКО**

АБАГРАВАЛЬНЫ СЕЗОН

## БЕЗ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДАТАЦЫІ КОШТ ЦВЁРДАГА ПАЛІВА ЛЮДЗЯМ БУДЗЕ НЕ ПА КІШЭНІ


*Сяргей Калянкевіч*

**Перабояў з палівам у сёлетнім абагравальным сезоне ў Беларусі не будзе. Аб гэтым заявіў на адной са сваіх прэс-канферэнцый міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр Мількота.**

"На дадзены момант, — паведаміў міністр, — у рэспубліцы маецца мазута на 70 сутак, пячнога бытавога паліва — на 52 сутак, каменнага вугалю — на 230 сутак, ёсць вялікі запас дроў".

Гэта па Беларусі ў цэлым. А ці забяспечана палівам на зіму наша Слонімшчына? Такое пытанне карэспандэнт "ГС" адрасаваў дырэктару прадпрыемства "Слонімскі гарпалівазбыт" Сяргею Калянкевічу. Вось што ён адказаў:

– Наша прадпрыемства забяспечвае цвёрдым палівам (брыкетам, вугалем і дровамі) арганізацыі і насельніцтва раёна. З боку гарпалівазбыту праблем па забяспячэнню палівам сёлета не будзе. Іншая справа, што ёсць некалькі нюансаў, якія вырашаюцца толькі на дзяржаўным узроўні. Гэта маюцца на ўвазе дзяржаўныя датацыі для насельніцтва. Зараз існуе, напрыклад, два кошты на брыкет — тона брыкету з датацыяй каштуе 24 тысячы рублёў, без датацыі — 78 тысяч. Ёсць яшчэ льготная цана для ўдзельнікаў вайны, інвалідаў першай і другой групы — 12 тысяч рублёў. Без датацыі мы паліва прадаем усім арганізацыям. Цвёрдае паліва мы можам сваёй тэхнікай прывезці заказчыку, але за падобную паслугу трэба заплаціць. Што датычыць чэргаў на паліва сярод насельніцтва, як гэта было раней, то цяпер іх няма. Бо цэны растуць, а дзяржаўная датацыя на паліва знаходзіцца на ўзроўні мінулага года. З-за таго, што датацыя кволая, гарпалівазбыт дзесьці на 30 % менш стаў прадаваць паліва. А па свабоднай цане людзі купляюць паліва слаба, бо няма ў іх грошай. Дарэчы, на вугаль датацыі дзяржава ўжо зусім не дае, таму купляць па 115 тысяч рублёў за тону вугалю не кожны жыхар Слонімшчыны зможа. Ды і яго практычна мала хто купляе. Нават брыкет па 78 тысяч за тону людзі бяруць слаба. Закупка паліва насельніцтвам залежыць толькі ад дзяржаўнай датацыі, без яе прыдбаць цвёрдае паліва людзям будзе цяжка. Ды і некаторыя арганізацыі Слоніма на сённяшні дзень застаюцца нашымі даўжнікамі: аддзел адукацыі нам за паліва павінен 15 мільёнаў рублёў, медаб'яднанне – 7 мільёнаў, аддзел культуры — каля трох мільёнаў рублёў, — сказаў карэспандэнту "ГС" Сяргей Калянкевіч.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

НАВІНЫ

# ГОТОВЬТЕ ПОДАРКИ ЗАРАНЕЕ


Фота Віталя ГІЛЯ
*Этих конфет хватит на весь Слоним*

**Более 300 наименований конфет для комплектации новогодних подарков предложило слонимчанам торговое ОАО "Світанак" на выставке-продаже, прошедшей на прошлой неделе во всех продуктовых магазинах предприятия, а также на базе по Минскому тракту.**

Директор "Світанка" Василий Духовник отметил, что на данный момент предприятие закупило 20 тонн кондитерских изделий.


"Мы готовы удовлетворить запросы самых требовательных покупателей, — сказал Василий Алексеевич. Наша выставка продлится до 31 декабря, поэтому все желающие могут выбрать любой новогодний подарок по своему усмотрению и на любую сумму", — отметил директор «Світанка».

Для комплектации подарков ОАО "Світанак" предлагает конфеты белорусских кондитерских фабрик. По словам Василия Духовника, таким образом, их предприятие поддерживает отечественного производителя.

**Ольга ШИНКЕВИЧ**

З ЗАЛЫ СУДА

# НАВЁЎ ПАРАДАК У АГАРОДЗЕ І АТРЫМАЎ ПОЗВУ Ў СУД


Фота Віталя ГІЛЯ
*Смецця ў лесе хапае*

**Жыхар вёскі Новая Стража Слонімскага раёна 74-гадовы Сяргей Мікалаевіч Кавальчук навёў у сваім агародзе парадак на зіму. Смецце, якое можна было спаліць — спаліў, а набрыняўшыя ад вільгаці карэнні капусты і іншай расліннасці, якую не ўзяў агонь, пагрузіў на воз і накіраваўся ў бліжэйшы лес.**

Лес каля Новай Стражы, куды кіраваў Сяргей Мікалаевіч, належыць Альбярцінскаму лясніцтву. І трэба сказаць, што мясцовыя жыхары часта вывозяць туды непатрэбны друз са сваіх падворкаў. Таму Сяргей Мікалаевіч без задняй думкі, што робіць нешта дрэннае, і павёз смецце ў лес. Пра тое, што чалавек сапраўды не ведаў, што нельга адыходы з агарода выкідаць у лесе, сведчыць і той факт, што Кавальчук пачаў разгружаць воз у прысутнасці работнікаў лясгаса, якія па нейкіх справах аказаліся на той час у лесе. Паспеў скінуў толькі некалькі вілоў смецця, як адзін з работнікаў лесу, Канстанцін Бот, падышоў і патлумачыў Кавальчуку, што за забруджванне леса той можа атрымаць штраф, калі яны складуць пратакол. Сяргей Мікалаевіч адказаў, што не ведаў, што гэтага нельга рабіць, і загрузіў назад тое, што паспеў скінуць з воза. Свой груз ён завёз на звалку ў кар'ер, і на тым, здавалася, і справе канец. Аднак праз некалькі дзён да Кавальчука ў хату прыйшоў той самы Канстанцін Бот у суправаджэнні міліцыянера і яшчэ аднаго работніка лягсаса. І сталі яны вельмі настойліва ўпрошваць Сяргея Мікалаевіча, каб ён падпісаў такі пратакол, што выгружаў смецце ў лесе, маўляў, яму за гэта нічога не будзе, а ім для справаздачы трэба. Кавальчук спачатку адмаўляўся падпісваць паперу. Але калі яму паказалі запоўнены ўжо пратакол быццам бы з яго подпісам, Сяргей Мікалаевіч падпісаў чысты ліст пратакола, па яго словах, для таго, каб параўнаць подпісы. Пасля чаго госці пакінулі хату, а гаспадар стаў чакаць, што будзе далей. І дачакаўся — позву ў суд на 13 лістапада.

Пра тое, што перажыў, атрымаўшы позву ў суд, пенсіянер і інвалід другой групы Сяргей Кавальчук, які да пенсіі сумленна адпрацаваў на Слонімскім тэлерэтрансляатары, быў перадавіком вытворчасці, меў толькі ўзнагароды і ніколі ні меў справы з судом, можна толькі здагадвацца. А вось яго жонка, таксама інвалід, якая прыйшла падтрымаць мужа, у кабінеце суддзі заплакала. Суддзя аднак хутка разабраўся ў сутнасці справы. І паколькі Кавальчук ніякай шкоды лесу не прычыніў, то суддзя закрыў так званую справу, абмежаваўшыся ў адрас Сяргея Мікалаевіча вуснай заўвагай. Бо смецце ў лес вывозіць усё такі нельга.

А тым часам праблема вясковых звалак і забруджвання лясоў, з якой так арыгінальна паспрабавалі змагацца работнікі Альбярцінскага лясніцтва, стаіць вельмі востра. У большасці вёсак раёна людзі вывозяць бытавыя адыходы куды заўгодна, у тым ліку і ў лес. Бо спецыяльных звалак там проста няма. Але і самі работнікі лесу не вельмі рупяцца, каб неяк паспрыяць вырашэнню праблемы. Не тое што шыльдачак з надпісамі кшталту "Вываз смецця забаронены", "Лес — наша багацце", "Беражыце лес" і падобных, якіх яшчэ, здаецца, нядаўна было ў лясах многа, сёння рэдка дзе сустрэнеш, але і на ўказальніках назвы лясніцтваў фарба так пасціралася, што адразу і не зразумець, хто ў гэтым лесе гаспадар.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

НАВІНЫ

## АТРЫМАЛІ ДВА "МАЗы"

**Нядаўна Слонімскі аўтапарк №3 атрымаў два новыя аўтобусы вытворчасці Мінскага аўтамабільнага завода.**

Пасажырскі аўтобус "МАЗ" для міжгародніх перавозак мае камфартабельны салон і 47 пасадачных месцаў. Каштуе такая машына 174 мільёны рублёў. Аднак, як адзначыў дырэктар аўтапарка №3 Уладзімір Нікалаеў, на еўрапейскія маршруты яго не пусціш, бо рухавік гэтай машыны не адпавядае стандарту "Еўра-2". Па словах дырэктара, хутчэй за ўсё новы аўтобус будзе курсіраваць на Брэст.

Другая машына мадыфікацыі "МАЗ-103", коштам 112 мільёнаў рублёў, папоўніла парк гарадскіх аўтобусаў. У Слонімскім аўтобусным парку "МАЗ-103" — трэці па ліку аўтобус такой мадэлі.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ЗДАРЭННІ

## УЗБУДЖАНА КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА

**На мінулым тыдні "ГС" пісала пра апаганьванне невядомымі Слонімскай мячэці.**

Нагадаем, што днём 9 лістапада старшыня мясцовага гарадскога аб'яднання мусульман Сулейман Байрашэўскі ўбачыў на сцяне храма надпіс "Время убивать", знак фашысцкай свастыкі і сімвал ядзернай небяспекі. 10 лістапада Сулейман Байрашэўскі паведаміў пра здарэнне ў міліцыю, а яшчэ праз дзень сюжэт пра гэта паказалі ў праграме "Нашы навіны" на канале ГНТ.

Пасля правядзення папярэдняй праверкі, міліцыя па гэтаму факту ўзбудзіла крымінальную справу.

## ЗАЯВІЛА ПРАЗ МЕСЯЦ

**У пенсіянеркі з вёскі Талькаўшчына ў кастрычніку з надворка прапаў веласіпед.**

Аднак у міліцыю жанчына звярнулася толькі 11 лістапада.

Вядуцца пошукі.

## З АЎТАМАШЫН ЗДЫМАЮЦЬ КОЛЫ...

**14 лістапада на стаянцы на новай Брэсцкай з іншамаркі аднаго з мясцовых жыхароў злодзеі знялі два колы.**

## ...І ДЗЯРЖНУМАРЫ

**У той жа дзень на Лабазоўцы, а 15 лістапада і на "Энцы" з аўтамабіляў двух слонімцаў прапалі дзяржнумары.**

Па дадзеных фактах работнікі міліцыі праводзяць пошукавыя мерапрыемствы.

## ВЫНЕСЛІ НАСЦЕННЫ ГАДЗІННІК

**На мінулым тыдні з кватэры жыхаркі вуліцы Пушкіна знік насценны гадзіннік.**

Злодзеі скарысталіся адсутнасцю гаспадыні дома. Тым больш, што пранікнуць у кватэру цяжкасці не складала – дзверы не зачыняліся.

Міліцыя праводзіць праверку.

## У "МАГІІ" РАЗБІЛІ ВІТРЫНЫ


**У парфюмернай краме "Магія" на Першамайскай вуліцы, якая належыць прыватнаму прадпрымальніку Юрыю Адамчуку, злаўмыснікі разбілі ноччу вонкавае шкло ў дзвюх вітрынах.**

Узбуджана крымінальная справа.


**Мікола КАНАНОВІЧ**

РЕПОРТЁР ВЫЕХАЛ НА МЕСТО

# ХОЛОДНАЯ ШКОЛА В ГЛОВСЕВИЧАХ


Фота Віталя ГІЛЯ

*Лидия Шемет*


Фота Віталя ГІЛЯ

*Кочегарят хорошо, а теплее не становится*

**Учащиеся Гловсевичской школы, как только на дворе понижается температура, сидят на уроках в верхней одежде, так как термометр в кабинетах показывает всего лишь +12.**

"Невозможно работать в таких условиях, — говорит директор школы Лидия Шемет, — ноги мерзнут, дети даже курток не снимают на уроках и в столовой кушают в верхней одежде".

А вся проблема в том, что маленькая школьная котельная отапливает не только школу, а еще и спортзал, школьную мастерскую, жилой дом на 12 квартир и 4-х квартирный дом. На обогрев этих помещений было выделено (по данным на октябрь) слишком мало топлива (14 тонн 80 килограммов).

"Директор совхоза «Победитель» Владимир Кемежук сказал, что школа плохо подготовилась к зиме. И предложил нам переходить на местные виды топлива, то есть заготавливать дрова», — сказала Лидия Шемет.

Из-за плохого отопления мерзнут не только школьники, но и жители двух домов, которые обогреваются котельной. Сама Лидия Сергеевна живет в таком доме. "Я, можно сказать, живу на кухне, так как там намного теплее, чем в зале и спальне. У меня телевизор стоит на кухне, кресло-кровать", — говорит женщина.

И продолжается все это безобразие, как говорят учителя школы, уже не первый год. "Директором школы я работаю уже 20 лет, — говорит Лидия Сергеевна, — и всё это время мы мерзнем каждую зиму".

Владимир Кемежук отметил, что совхоз помогает школе, чем может, выделяет транспорт, делает ремонт и т.д.

"Однако мы не обязаны поставлять топливо для школы, — отмечает Владимир Павлович. — И, помоему, все годы его хватало. Здесь проблема в слабой котельной".

И пока взрослые обсуждают технические возможности котельной, 39 школьников учатся, укутавшись в теплую одежду. Видимо, ребят закалила низкая температура в помещениях, так как, по словам Лидии Шемет, никто из школьников пока что не заболел.

**Ольга ШИНКЕВИЧ**


Фота Віталя ГІЛЯ

*Своя куртка теплее, чем школьная батарея*

ВОПРОС – ОТВЕТ

## СТОИТЬ ЭТО БУДЕТ НЕДЕШЕВО

*Почти у всех жителей, которые проживают в доме над магазином "Юбилейный" в Слониме, телефоны запараллелены. Говорят, чтобы получить отдельную линию, нужно будет заплатить как за установку нового телефона. Почему так?*

**Жители дома ул. К. Давыдюк, 1.**

На вопрос читателей отвечает начальник районного узла электронной связи Сергей Карачаров.

"Пока что у нас нет технических возможностей распараллеливать квартирные телефоны в этом районе, так как не хватает свободных линий.

А вот когда они появятся, желающие могут получить отдельный номер. Однако, абоненту придется заплатить, как за установку нового телефона. О цене такой услуги пока еще рано говорить, я только одно могу сказать, что стоить это будет недешево".

**Ольга ШИНКЕВИЧ**

ЗДАРЭННІ

## МЕХАНІЗАТАР ТРАПІЎ ПАД ТРАКТАР

**У калгасе імя Леніна Слонімскага раёна мясцовы механізатар трапіў пад колы трактара.**

У выніку чаго мужчына загінуў. Вядзецца праверка.

## НАЕХАЎ НА ЧАЛАВЕКА

**Позна вечарам 14 лістапада адзін з работнікаў Слонімскай птушкафабрыкі вяртаўся на аўтамабілі дамоў.**

На шашы Слонім — Сяňкоўшчына, каля вёскі Ганькі, вадзіцель не заўважыў чалавека, які ляжаў на дарозе і наехаў на яго.

У выніку 50-гадовы жыхар Ганькоў загінуў.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬСЯ

# ИДЕШЬ ДОМОЙ – ЗАХВАТИ ПАЛКУ

**В последнее время в Слониме появилось слишком много улиц, переулков, по которым стало страшно ходить: разбитые дороги, освещения – никакого. Плюс ко всему – бездомные собаки, которые стаями бегают по улицам и пугают одиноких прохожих.**


Фота Віталя ГІЛЯ

*По переулку Мирошника не пройти, не проехать*

"Иду вечером с работы и беру в руки палку, чтобы в темноте от собак отбиваться, — рассказывает жительница переулка Мирошника в Слониме, — иначе домой по переулку, где нет ни одного фонаря, трудно пройти".

"Мы готовы за свой счет менять лампы в фонаре, лишь бы нам хоть один поставили", — говорит Сергей Александрович Паценко, житель переулка Мирошника.

Более того, в темноте людей там ждут и другие препятствия: огромные лужи, ямы. Переулок Мирошника стоит на болоте. Для того, чтобы построить там дома, по словам жителей, понадобилось 50 грузовых автомобилей с песком, чтобы поднять грунт.

У жителей с улицы Черняховского похожая проблема: нет освещения. "Моя дочь поздно возвращается с практики, — рассказывает слонимчанка Галина Николаевна Апенько, — и ей страшно одной идти в полной темноте, поэтому мы с отцом ее постоянно встречаем. Ведь девушка может столкнуться не только с бродячими собаками, но и с жуликами. Мне страшно за свою дочь".

Директор слонимского дорожно-эксплутационного участка Иван Якимец прокомментировал эту ситуацию следующим образом: "На переулке Мирошника есть несколько фонарей, они расположены на перекрестке. Правда, там перегорели лампы и из-за этого не было света. Однако на днях лампы там будут заменены, мы их недавно получили. И на улице Черняховского заменим. Поэтому, пусть народ не волнуется: свет будет".

**Ольга ШИНКЕВИЧ**

ПОЧТА

# БОЛЬНО И ОБИДНО...

**Я очень редко стараюсь бывать в нашей районной поликлинике. Меня просто убивает неуважительное и невнимательное отношение медиков к пациентам.**


Фота Віталя ГІЛЯ

*Очередь в приёмном покое*

Хочу рассказать такой случай. Однажды, придя на прием к врачу, я стала говорить с ним о своей болезни, о самочувствии. В это время врач что-то читал в рецепте, где было написано всего пару слов. Читал он долго. Было видно, что он даже и не пытается меня слушать. Так и не подняв на меня глаза, он быстро что-то выписал. На этом мой прием и закончился.

Через некоторое время я стояла в очереди уже к другому врачу, невропатологу. Со мной на прием в основном сидели пожилые люди. Врач принимал медленно, периодически выходя из кабинета на какое-то время. К нему на прием пришла старенькая женщина. Она стала рассказывать всем сидящим в очереди, что приехала из деревни, ей очень тяжело было добираться до больницы. Автобусы, по словам бабушки, ходят редко, поэтому она приехала поздно, и ей не хватило талончика на прием к невропатологу. Люди в очереди посоветовали ей зайти в кабинет и попросить врача принять без талончика. Она так и сделала. И тут мы все, сидящие в коридоре, наблюдали следующую сцену: врач вывел бабушку из кабинета и начал кричать: "Я никого не принимаю без талончика!".

Мы были в шоке от такого бесчеловечного обращения врача к пациенту.

Больно и обидно стало за всех нас.

**Л.Г. ПАНЬ**

ЗЭЛЬВА

## НАЧНАЯ ТРАГЕДЫЯ

**У той чэрвеньскі вечар 21-гадовы жыхар вёскі Зальвянка Аляксандр Філёнчык нічога дрэннага не прадчуваў, калі садзіўся за руль матацыкла.**

Матацыкл яго бацька набыў каля 20-ці год таму, і доўгі час той стаяў няспраўны. Але Аляксандр яго адрамантаваў і ў апошні час гойсаў па вясковых вуліцах, нягледзячы на тое, што матацыкл не прайшоў тэхагляд. Больш таго ў хлопца не было і вадзіцельскага пасведчання. У 2001 годзе Філёнчык быў затрыманы за рулём калгаснага трактара ў нецвярозым стане і пазбаўлены права кіравання на тры гады. Так што быў Аляксандр увогуле "бяспраўны". Ды і матацыкл не адпавядаў тэхнічным патрабаванням: не працавалі тармазы, задні ліхтар і ўказальнікі паваротаў.

15 чэрвеня каля 10 гадзін вечара Аляксандр Філёнчык паехаў на дыскатэку ў вёску Барodзічы. Там нічога для яго не было цікавага, і хлопец рашыў паехаць у суседнюю вёску Крывічы. Па дарозе ён патрапіў на групу знаёмых, якія ў лесе адзначалі дзень нараджэння свайго таварыша.Тут жа былі і аднавяскоўцы Філёнчыка — Дзмітрый Каленка і Сяргей Боцька. Філёнчык таксама далучыўся да"віншавання". Усе разам яны выпілі каля трох літраў гарэлкі і каля 24 гадзін пайшлі на вясковую дыскатэку. Філёнчык пакінуў матацыкл на падворку ў знаёмага, які жыў каля клуба. Праз некаторы час на дыскатэцы да Аляксандра падышлі Каленка і Боцька. Танцы ім не спадабаліся, і хлопцы папрасілі Філёнчыка адвезці іх дадому. Аляксандр згадзіўся. Праз некалькі хвілін Філёнчык, Каленка і Боцька імчалі па вясковай дарозе. Не прахаўшы 300 метраў, Сяргей Боцька крыкнуў Дзмітрыю, каб той папрасіў Аляксандра зменшыць скорасць. Дзмітрый Каленка дакрануўся да пляча Філёнчыка, і хлопец павярнуў галаву ў яго бок. Пра што гаварыў Каленка, Філёнчык так і не пачуў, а калі ён глянуў на дарогу, то за 2-3 метры ад матацыкла ўбачыў слуп. Адзінае, што паспеў зрабіць Філёнчык, гэта затармазіць. Пасля адчуў удар...

У гэты час недалёка ад клуба на скамейцы сядзелі хлопец з дзяўчынай. Маладыя людзі чулі гул матацыкла, потым грукат жалеза. Прадчуваючы нядобрае, яны пабеглі паглядзець, што ж здарылася. Калі падышлі бліжэй, то каля прыдарожнага слупа лініі электраперадач убачылі зламаны плот, а побач матацыкл, перад якім ляжалі Філёнчык і Каленка, а крыху далей знаходзіўся Боцька. Не губляючы часу, маладыя людзі пабеглі за дапамогай.

Праз пэўны час бацька і маці Сяргея Боцькі былі ў Крывічах на месцы здарэння. Тут жа стаяла машына "хуткай дапамогі". Надзея на тое, што Сяргея можна выратаваць, не спраўдзілася: ужо па дарозе ў бальніцу стала зразумела, што хлопец загінуў...

У выніку дарожна-транспартнага здарэння Аляксандр Філёнчык атрымаў траўму і быў дастаўлены ў Зэльвенскую бальніцу. 17-ці гадовы Сяргей Боцька ад цяжкіх калецтваў памёр на месцы аварыі. Дзмітрый Каленка не пацярпеў.

Суд Зэльвенскага раёна вынес раней судзімаму Аляксандру Філёнчыку прыгавор — пяць гадоў пазбаўлення волі.

**Віталь АГАРОДНІК, Наталля ГЛУШЭНЯ**

ГРОДНО

# ПРОШЕЛ VII СЪЕЗД АКУШЕРОВ-ГИНЕКОЛОГОВ БЕЛАРУСИ



**Государство должно сделать приоритетом своей демографической политики не уменьшение младенческой и материнской смертности, а повышение рождаемости.**

Таков основной вывод, зафиксированный в резолюции седьмого съезда акушеров-гинекологов и неонатологов, который завершился 15 ноября в Гродно.

Младенческая и материнская смертность в Беларуси в последние годы является самой низкой в постсоветских странах, она достигла среднеевропейского уровня. Если в 60-х годах на 54 тысячи умерших приходилось около 7 тысяч младенцев до одного года, то сейчас на 140 тысяч умерших за год приходится всего 840 младенцев до года. При родах сейчас умирает около 20 женщин ежегодно. Об этом на пресс-конференции, состоявшейся после съезда, сообщил главный акушер-гинеколог Министерства здравоохранения Беларуси Владимир Силява.

В то же время, если в 1960 году в Беларуси родилось 200 тысяч человек, то в прошлом — только 92 тысячи. С такими показателями через 5—6 лет в республике будет только около 1,5 миллиона детей. Это чревато крахом всей социальной сферы, особенно на селе.

Более 200 тысяч пар отказываются от рождения второго ребенка. Ежегодно прерывается около 100 тысяч беременностей. Еще около 200 женщин страдают бесплодием. По словам главного акушера страны, именно эти категории и являются резервом для повышения рождаемости в стране.

"Если убедить хотя бы 10 процентов женщин не делать аборт — это уже 10 тысяч сохраненных человеческих жизней, целый город", — сказал Силява.

По его словам, основной задачей государства в ближайшее время должны стать формирование репродуктивной потребности населения, а также лечение бесплодия. Между тем в республике совсем нет социальной рекламы, формирующей стремление к рождению детей.

"Я не призываю "плодить нищету", — сказал Силява. — Но мы должны убедить здоровых, успешных женщин, что никакая карьера не заменит ребенка. Если мы хотим, чтобы в старости за нами кто-то ухаживал — мы должны рожать детей".

**БелаПАН**

ЮБІЛЕЙ

# РАГОЗНІЦКАМУ КРУХМАЛЬНАМУ ЗАВОДУ — 90 ГАДОЎ

**На мінулым тыдні Рагозніцкі крухмальны завод адсвяткаваў сваё дзевяностагоддзе. З гэтай нагоды ў вясковым клубе адбылося святочнае пасяджэнне і артысты раённага дома культуры наладзілі канцэрт.**

Першапачатковым уладальнікам гэтага завода, які размясціўся ў маёнтку Рагозніца, быў О. Майштовіч. Зараз немагчыма назваць дакладную дату заснавання завода, бо ў нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, што месціцца ў Гродне, у пратаколе ад 22 верасня 1912 г. аб параацэнцы фабрычных, заводскіх і прамысловых прадпрыемстваў Ваўкавыскага павета ўпамінаецца крухмальны завод у маёнтку Рагозніца. Тады ён меў вартасць 9759 рублёў і працавала на ім 6 чалавек. Што датычыць абсталявання, то на ім была ў той час мыйка на 25 тон бульбы ў суткі, а таксама прыстасаванні для не пераціркі, асушальная цэнтрыфуга і тры размывачныя чаны з мяшальнымі цэнтрыфугамі. У якасці паліва выкарыстоўваўся торф, што рабочыя нарыхтоўвалі ўлетку. Завод меў асвятленне ад генератара пастаяннага току. Ваду для вытворчых працэсаў бралі з рэчкі Юхнаўка і туды ж скідалі адыходы.

Не спынялася вытворчасць і ў гады першай сусветнай вайны. У 1915 годзе былі пабудаваны першы і другі паверхі вытворчага корпуса. У 1916 г. рэканструкцыя была поўнасцю закончана. Надалей звесткі пра завод не захаваліся. Толькі вядома, што яго рэканструкцыя распачалася ў 1965 годзе і завяршылася ў сакавіку 1968 г. Тут было ўстаноўлена абсталяванне айчыннай вытворчасці. За суткі можна было перапрацоўваць да 100 тон бульбы і атрымліваць да 15 тон сухога крухмалу. Сыравіна дастаўлялася з трох раёнаў: Мастоўскага, Шчучынскага і Зэльвенскага. Звычайна яе нарыхтоўвалі да 17 тысяч тон, аднак гэтых запасаў хапала ненадоўга, і пасля заканчэння бульбы пачыналі перапрацоўваць на сухі крухмал кукурузу. Аднак абсталяванне хутка састарэла, і ў 1991 годзе распачалася новая рэканструкцыя. Распачаў яе Іван Кваpтнік. Магутнасці прадпрыемства павялічыліся да 500 тон у суткі. Сёлета вынікі наступныя: было закуплена 6 тысяч тон бульбы, і яе перапрацоўка заканчваецца. Каб мець прыбытак, на прадпрыемстве выпускаюць таксама макароны, а зараз асвоены выпуск бульбянога паўфабрыкату. Ужо намечана рэканструцыя прадпрыемства. У 2003 г. на яе будзе затрачана 2, 94 млрд. рублёў, а ў 2004 г.—3,6 млрд. рублёў. Завод набудзе новае тэхнічнае абсталяванне.

**Антон МАКЕЙ**

ГРОДНО

## ПЕРВЫМ РЕЗИДЕНТОМ СЭЗ "ГРОДНОИНВЕСТ" СТАНЕТ ЛИТОВСКОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ

**Иностранное частное унитарное производственное и торговое предприятие "Е5иКО" со 100-процентным литовским капиталом завершает строительство на территории свободной экономической зоны "Гродноинвест" первой очереди текстильного комплекса — швейной фабрики по производству швейных и трикотажных изделий.**

Как сообщил БелаПАН заместитель председателя комитета экономики Гродненского облисполкома Сергей Дайнеко, пуск ее планируется осуществить в этом году, возможно, в конце ноября.

По словам Дайнеко, реализация данного проекта поддержана местными властями, которые оказали инвестору поддержку в решении организационно-технических вопросов, разработке и согласовании проектной документации.

В настоящее время завершается создание конкурсной комиссии СЭЗ "Гродноинвест", в состав которой войдут представители ее администрации, работники областного и городского исполнительных комитетов. В ближайшее время СЭЗ приступит к регистрации своих резидентов, первым из которых и станет предприятие "Е5иКО".

**Ирина САЗАНОВИЧ**

ВОЛКОВЫСК

## ПАДЁЖ СКОТА ПРОДОЛЖАЕТСЯ

**Ранее газета сообщала об отравлении скота в колхозе имени Заслонова Волковысского района жомом, прибывшим из Городеи.**

В настоящий момент дойное стадо здесь уменьшилось на 276 голов. Кроме этого пострадали и другие хозяйства, куда был завезен некачественный корм.

«Под нож» пришлось пустить 200 голов в колхозе имени Родина, 155 — в «Красном Груде», погибло 7 животных из личных подворий сельчан, поживившихся колхозным жомом.

## ПРЕДАНЬЯ СТАРИНЫ ГЛУБОКОЙ

**В военно-историческом музее имени Багратиона открылась выставка под названием «Древняя печатная книга».**

Посетителям музея предоставляется редкая возможность увидеть книги, иконы, предметы быта XVI — XVIII веков из собраний Минской духовной семинарии и Жировичской академии.

Знакомить посетителей с экспонатами этой интересной выставки будут необычные экскурсоводы — студенты духовной семинарии.

Продлится она десять дней, посещение бесплатное.

## ВОКЗАЛ — МЕСТО ОПАСНОЕ

**Вечером на привокзальной площади по улице Жёлудева неизвестные избили жителя деревни Подрось и отобрали у него все имеющиеся деньги.**

Потерпевший с телесными повреждениями доставлен в местную больницу.

По факту ведётся следствие, уже есть подозреваемые.

## ЧЁРНАЯ НЕБЛАГОДАРНОСТЬ

**Возбуждено уголовное дело в отношении 14-летней жительницы г.Волковыска.**

Она проникла в помещение ординаторской травмотологического отделения больницы и похитила деньги в сумме 35 тысяч рублей, принадлежащих одному из местных врачей.

## СТРАДАЮТ НЕ ТОЛЬКО ПЕШЕХОДЫ

**На улице Софьи Панковой был совершён наезд на инспектора ГАИ, нёсшего патрульную службу.**

Водитель автомашины «Мазда» с места происшествия скрылся. Пострадавший, 30-летний милиционер, доставлен в больницу.

Водитель иномарки задержан.

## ОЧЕРЕДНАЯ ЖЕРТВА КУРЕНИЯ

**В дачном посёлке Козьи Горы произошёл пожар на даче гражданина Ш.**

В результате пожара погиб 30-летний родственник хозяина дачи. Огонь уничтожил кровлю, внутреннюю отделку и имущество, находящееся в строении.

При расследовании причин пожара установлено, что возгорание произошло от неосторожности при курении.

**Александр ДАНИЛИН**

ЗЭЛЬВА

## УПАЎ З ЧАЦВЁРТАГА ПАВЕРХА

**Днямі ў Зэльве здарыўся трагічны выпадак.**

47-гадовы мясцовы жыхар спрабаваў пералезці са свайго балкона на суседскі, але мужчына не разлічыў свае сілы і магчымасці. У выніку ён сарваўся з чацвёртага паверха і загінуў.

**Наталля ГЛУШЭНЯ**

МАСТЫ

## КРАДУЦЬ УСЁ БОЛЕЙ І БОЛЕЙ

**Як паведаміў пракурор Мастоўскага раёна Юрый Васілеўскі, сёлета колькасць крадзяжоў ад агульнай колькасці правапарушэнняў складае 52,7%.**

Па ягонаму меркаванню, гэта лічба значна большая, бо не ўсе крадзяжы зарэгістраваны і не ўсе пацярпеўшыя звяртаюцца ў праваахоўныя органы. Штогод расце і агульная колькасць злачынстваў у раёне, у бягучым годзе яна павялічылася на 37%. На 18 злачынстваў павялічылася колькасць зарэгістраваных цяжкіх злачынстваў. За дзевяць месяцаў 20 злачынстваў учынілі непаўналетнія.

Адпаведна ўзрасла колькасць разбойных нападаў, рабаўніцтваў, а таксама хуліганскіх учынкаў. Павялічылася злачынасць і ў самым горадзе. За дзевяць месяцаў тут зарэгістравана 128 фактаў правазаконных дзеянняў.

Сярод населеных пунктаў вызначаецца Мастоўскі сельсавет— 19, Дубенскі — 18, Пацавіцкі — 12.

55 злачынстваў засталіся нераскрытымі.

## ЗАБІЎ СЯБЕ САМ

**Мастаўчанін К., пасля чарговай чаркі, вырашыў развітацца з жыццём. Абліў сябе гаручай сумессю і падпаліў.**

Са шматлікімі апёкамі небарака быў дастаўлены ў бальніцу.

Дактары рабілі ўсё магчымае, каб выратаваць чалавека, але на жаль ім гэта не ўдалося.

Мужчына памёр.

## "СПРЫТНЫ" МАТАЦЫКЛІСТ

**На Зэльвянскай вуліцы матацыкліст наехаў на кабельную шафу сувязі і збіў яе.**

Адначасова ў жыхароў гэтага раёна з'явіліся праблемы з тэлефоннай сувяззю.

Потым матацыкліст пратараніў плот. Для многіх застаецца загадкаю, як пасля гэтага ён змог уцячы з месца здарэння.

**Антон МАКЕЙ**

ШЧУЧЫН

## АДЛІЧВАЮЦЬ ДЗЁННЫ ЗАРОБАК

**Аддзел культуры Шчучынскага райвыканкама правёў суботнік і заробленыя на ім грошы, як сцвярджаюць дасведчаныя людзі — 15 тысяч рублёў, пералічыў на будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі.**


Частка супрацоўнікаў па пэўных прычынах не змагла прыняць удзел у мерапрыемстве.

Падрыхтаваны дакумент, згодна якога з гэтых людзей будзе ўтрыманы дзённы заробак.

**Антон МАКЕЙ**

РЕЛИГИЯ

# РАСКОЛ В ИСЛАМСКОЙ ОБЩИНЕ БЕЛАРУСИ


*Пятничная молитва белорусских мусульман, г. Ивье, Гродненская обл., ноябрь 2001 года*

Фота IREX/ProMedia

**Впервые за 600-летнюю историю исламской общины Беларуси в ней произошел раскол. Так в интервью БелаПАН председатель Мусульманского религиозного объединения в Республике Беларусь муфтий Исмаил Александрович прокомментировал создание Духовного управления мусульман в Республике Беларусь (ДУМБел), которое недавно было зарегистрировано в Комитете по делам религий и национальностей при Совете министров.**


*Имам слонимской мечети Сулейман Байрашевский*

Фота Віталя ГІЛЯ

По словам муфтия, в новое объединение вошли исламские общины Слонима, Клецка, Ляховичей, Витебска и Минска. "Мы считаем, что раскол белорусских мусульман, которые составляют 0,3 процента всего населения страны, лишь усугубит наши внутренние проблемы в деле национального возрождения", — сказал И.Александрович. По его словам, причинами раскола являются личные амбиции лидеров нового объединения, которые они "не смогли удовлетворить общепризнанными демократическими методами". "Так, на последнем съезде Мусульманского религиозного объединения, который состоялся в 2000 году, мы предлагали им изложить свою программу действий, однако получили отказ", — сказал муфтий. По его словам, в результате раскола в объединении осталось 18 общин и 6 мечетей. В стране проживает примерно 30 тыс. человек, которые представляют нации, традиционно исповедующие ислам. Среди них 10.090 татар, 6.500 азербайджанцев, а также от 70 до 2.000 узбеков, таджиков, туркмен, башкир, арабов, чеченцев, турок и представителей других наций, постоянно проживающих в Беларуси.

В интервью БелаПАН председатель ДУМБел муфтий Исмаил Воронович сообщил, что главной причиной создания нового объединения является необходимость охватить не только верующих белорусских татар, но и всех остальных людей, исповедующих ислам. "В наше объединение вошли исламские общины, которые действовали автономно. Мы хотели бы расширить контакты верующих Беларуси и России, которая в определенной степени является исторической родиной для местных мусульман", — сказал муфтий. По его словам, приоритетом деятельности ДУМБел является распространение и утверждение среди мусульман традиционного ислама, который существует в Беларуси не одно столетие, а в России — более тысячи лет. "Мусульманское же религиозное объединение пытается его искоренять, ориентируясь на помощь арабских стран. Опасность состоит и в том, что в объединение стали внедряться верующие из стран, где ведущим направлением ислама является ваххабизм", — подчеркнул муфтий.

Председатель слонимской Мусульманской общины Сулейман Байрашевский сообщил корреспонденту «ГС», что на сегодняшний день в Слониме проживает около 200 человек, исповедующих ислам. Большинство из них — это российские татары. Коренных слонимских татар насчитывается 56 человек, затем идут азербайджанцы и мусульмане других национальностей.

По словам Сулеймана Байрашевского, с 1992 года и до вступления осенью этого года в ДУМБел слонимская Мусульманская община существовала автономно.

**Марат ГОРЕВОЙ, Микола КОНОНОВИЧ**

ДЗЯТЛАВА

## АСЦЕРАГАЙЦЕСЯ НЯПРОШАНЫХ ГАСЦЕЙ

**Ужо не першы раз у вёску Руда-Яварская Дзятлаўскага раёна наведваюцца цыганы.**

Вёска гэта знаходзіцца ў глыбінцы, сярод дрымучых лясоў. Цыганы просяцца то вады папіць, быццам на двары няма калодзежа, то яшчэ што-небудзь прыдумаюць, абы патрапіць у дом.

Вось і нядаўна "смага" прывяла іх у хату да пенсіянеркі В. Жанчына і вокам не паспела міргнуць, як з яе дамашняга тайніка зніклі 200 даляраў ЗША.

## МАЛАЛЕТНІ ЗЛАЧЫНЦА

**Вучань 9 класа Дзятлаўскай школы-інтэрната познім восеньскім вечарам разбіў акно ў адным з дамоў вёскі Нясілавічы, дзе цяпер ніхто не жыве, і ўкраў пнеўматычнае ружжо, электрадрэль і вопратку.**

Усе гэтыя рэчы належалі жыхару горада Ліда.

Вядзецца следства.

## У ДЗЯТЛАЎСКІХ НАСТАЎНІКАЎ НОВЫ КІРАЎНІК

**На пасаду загадчыка аддзела адукацыі Дзятлаўскага райвыканкама нядаўна прызначаны Станіслаў Фабішэўскі.**

Да гэтага ён працаваў дырэктарам дзятлаўскай сярэдняй школы №3.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ**

ГРОДНО

## ПРОКУРАТУРА «ПРИЖАЛА» «ЮНИОН ИМПЕКС»

**Уголовное дело в отношении должностных лиц московского ООО "Юнион Импекс" возбудила прокуратура Гродненской области, сообщает газета "Советская Белоруссия".**

По материалам следствия, российские предприниматели в 2001 году без регистрации представительства в качестве налогоплательщика осуществляли финансово-хозяйственную деятельность на территории Беларуси. Проще говоря, изготавливали и реализовывали обувь. Как сообщили в пресс-центре Комитета государственного контроля, в результате доход бизнесменов составил более 22 миллионов рублей.

**Наталья ФУРСОВА**

ГАНЦЕВИЧИ

# 16-ЛЕТНИЙ ШКОЛЬНИК ЗАДУШИЛ ЖЕНЩИНУ

**Отдел внутренних дел Ганцевичского района Брестской области возбудил уголовное дело в отношении 16-летнего школьника, подозреваемого в убийстве 83-летней жительницы деревни Ковали.**

Женщина была найдена 9 ноября в своем доме без признаков насильственной смерти. 11 ноября судебно-медицинская экспертиза установила, что женщину задушили. В ходе следствия выяснилось, что с целью хищения денег ее убил житель этой же деревни — ученик 9 класса Ганцевичской школы-интерната 16-летний Н.

Он проник в дом пенсионерки в ночь с 8 на 9 ноября, выбив дверь. Преступник потребовал деньги, так как знал, что накануне женщине принесли пенсию. В результате деньги были похищены, а старушка задушена. Труп обнаружила работница почты, которая 9 ноября пришла со второй половиной пенсии.

При обыске у Н. были найдены 39 тыс. рублей. По словам сотрудников Ганцевичского РОВД, юноша на учете в милиции не состоял. Как сообщили БелаПАН в Ганцевичском РОВД, школьник сознался в преступлении.

**БелаПАН**

ГРОДНО

# РЕАЛИЗУЕТСЯ ПРОГРАММА "ЗДОРОВОЕ ПОКОЛЕНИЕ"

**На прошлой неделе в Гродно стартовала программа "Здоровое поколение", которую осуществляет областной Центр здоровья.**

Основные цели программы — профилактика ранних половых связей, ранних беременностей и половых заболеваний среди учащейся молодежи.

По словам специалиста центра Ирины Дубок, информация, касающаяся сексуально-репродуктивного здоровья, будет распространяться в первую очередь среди неформальных молодежных лидеров. А они будут информировать об этих проблемах своих сверстников. "Молодежь чаще обращается за советом или помощью к своим ровесникам, — отметила Ирина Дубок. — Мы и намерены это использовать. Это так называемое "обучение равных равными".

Программа осуществляется на базе общежития Гродненского колледжа бытового обслуживания, потому что здесь совпало несколько факторов риска для репродуктивного здоровья (большая часть студентов колледжа — девушки из сельской местности).

Программа рассчитана на два года.

**Ирина ЧЕРНЯВКА**

## РАСЦЕНКИ
### В «Газеце Слонімскай»
**на рекламные услуги:**

Строчная (частная) реклама — **3050 руб.**,
Поздравление — **4310 руб.**,
Поздравление с фото — **4690 руб.**,
Соболезнование, благодарность — **2630 руб.**,
Модульная реклама — 1 кв.см — **813 руб.**
Дополнительная плата взимается ЗА СРОЧНОСТЬ + **1000 руб.**;
Поздравление В РАМОЧКЕ + **1000 руб.**;
Реклама, выделенная ЦВЕТОМ, + **30%** от стоимости;
Реклама на 1 и 16 стр. + **50%** от базовой стоимости;
Частная реклама С ФОТО — **5000 руб.**
Вашу рекламу мы также можем разместить в Интернете. Эта услуга стоит + **20%**.
В нашей газете могут поместить поздравление или рекламу жители соседних регионов.
Для этого необходимо оплатить стоимость заказанного объявления на наш
**р/с 3013215550011 в АСБ «Беларусбанк», ф. 422 в г. Слониме, код 852 УНН 590079996**
и отправить текст вместе с квитанцией по адресу:
**231800, г. Слоним Гродненской области, ул. Комсомольская, 8, «Газета Слонімская» или по факсу 2-49-39.**

Последний срок подачи заявлений на публикацию в текущий номер —
**понедельник 18.00.**
**Время работы рекламного отдела с 9.00 до 18.00, воскресенье — с 12.00 до 17.00, выходной — суббота.**

## ВНИМАНИЕ!
«Газета Слонімская» приглашает к сотрудничеству **творческих молодых людей,**
которые желают связать свою деятельность с журналистикой.
Информация по тел. **2-14-39**
или в редакции по адресу: **Слоним, ул. Комсомольская,8.**


**Невеста**
Слоним, пл. Ленина, 11
Тел. 4-20-03
*Новая коллекция*
Европейский стиль и качество.
Уникальные дизайнерские и конструкторские разработки.
Широкий ассортимент в наличии и под заказ.
Прокат свадебных и вечерних нарядов, бальных детских платьев, мужских костюмов.
Лиц. ББС №05908, 10.05.00-10.05.05.

**Тел. 2-14-02** (10.00-18.00)
**2-19-88** (вечером)
**Салон «Джессика»**
ЭЛИТНАЯ КОЛЛЕКЦИЯ
Прокат свадебной, вечерней одежды, мужских костюмов (смокингов) пр-ва фирм Европы и Америки.
*Роскошные подвенечные платья со шлейфами*
*Фата под заказ, украшения на машину по-американски, подгонка по фигуре, причёска, все аксессуары — бесплатно.*
Г. Слоним, гостиница «Щара».
Лиц. ББС №01538, 09.06.99-09.06.04.

*Лучшие невесты одеваются у нас!*
*Свадебный салон «Виктория»*
*Если не хочешь отставать от моды, посети салон «Виктория»*
**Т. 2-16-00, ул. Гнедаша, 7 (возле вневедомственной охраны).**

**Центр вспомогательной репродукции "ЭМБРИО", ОДО "БелИвПул"**
**Только у нас!**
**Все виды и этапы лечения проводятся в Минске.**
**Для пациентов проходивших лечение в любых центрах мира на технологии ЭКО предоставляем скидки до 20%.**

**1.** Лечение бесплодия методом экстракорпорального оплодотворения (ЭКО).
1.1. Классический метод ЭКО.
